**ЛІТАРАТУРА**
1. Bull, S. World War I Tranch Warfare (1), 1914–16 / Dr. Stephen Bull ; il. by Adam Hook. – Oxford : Osprey Pablishing, 2002. – 64 p.: il.
2. Der Feldgraue. Leitfaden für den Dienstunterricht des Feldartilleristen in fahrenden und reitenden Batterien. – Stalling, 1917. – VIII, 304 s : III.
3. Histories of Two Hundred and Fifty-One Divisions of The German Army Which participated in The War (1914-1918) : compiled from records of intelligence section of the General Staff, American Expedition Ary Forces, at General Head-Quarters : : Chaumont, France : : 1919 / [War Department]. – Washington : Government Printing Office, 1920. – 748 p.
4. Vorschriften fur den Stellungskrieg fur alle Waffen. T. 1. Stellungsbau / Kriegsministerium. – Berlin, 1916. – 90 s.
5. Шелавин, Н. Германские позиции 1915—1918 гг. на Западном фронте / Н. Шелавин // Война и Революция – 1920. [Электронны рэсурс] – рэжым доступу: http://www.fortressby.com/index.php?option=com_deeppockets&task=catContShow&cat=57&id=77&Itemid=29 – Дата доступу: 20.11.2013.
6. Шперк, В. Ф. Фортификационный словарь / В. Ф. Шперк. М. : ВИА, 1946. –126 с.
7. Эрр, Ф.-Ж. Артиллерия в прошлом, настоящем и будущем / Фредерик-Жорж Эрр. – Изд. 2-е. – М. : Воениздат НКО СССР, 1941. – 348 с. – (Библиотека командира).

**АСТАПОВІЧ А.А.**
Старшыня Рэспубліканскага савета Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, г. Мінск, Беларусь

## НАТУРНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ ФАРТЫФІКАЦЫЙНАГА АНСАМБЛЮ 1915 – 1918 ГГ. НА ЗАХОДНІМ БЕРАЗЕ ЗАДЗЕЕЎСКАГА ВОЗЕРА У ПАСТАЎСКІМ Р-НЕ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛ.

Лінія расійска-германскага фронту на ўсходнім тэатры ваенных дзеянняў Першай сусветнай вайны на захад ад Пастаў усталявалася ў выніку ваенных дзеянняў 1915 г. – Свянцянскага прарыву і яго наступнай ліквідацыі. Менавіта з 1915 па кан. 1917-га гг. на Ўсходнім фронце адсутнічаюць баявыя дзеянні мабільнага характару. Вайна становіцца пазіцыйнай, што прыводзіць да ўладкавання ўмацаваных пазіцый пры дапамозе ўжо вядомых на той час сродкаў палявой фартыфікацыі – акопы, умацаваныя стралковыя гнёзды і артылерысцкія пазіцыі, калючы дрот і іншыя сродкі.

У параўнанні з палявой фартыфікацыяй, якую выкарыстоўвала Руская імператарская армія, нямецкія ўмацаванні карэнным чынам адрозніваліся ва ўладкаванні агнявых пазіцый, памяшканняў для прабывання асабовага складу і складскіх памяшканняў. На час вядзення вайны ў тагачаснай імператарскай Расіі, нягледзячы на бурны перадваенны эканамічны рост, цаментная прамысловасць па сваіх магутнасцях у некалькі разоў адставала ад тэрыторыі Цэнтральнай і Заходняй Еўропы. Адзін з найвялікшых цаментных заводаў быў здадзены ў эксплуатацыю ў Ваўкавыску ў 1913 г., адпаведна з 1915 г. дадзенае прадпрыемства працавала на кайзераўскі ваенны патэнцыял.

Недахоп будаўнічага матэрыялу, які з'яўляўся асновай для вырабу бетонных канструкцый, і абумовіў ўзвядзенне Рускай імператарскай арміяй абарончых збудаванняў з дрэва – гэта шматнакатныя бліндажы, доўгатэрміновыя земляныя агнявыя кропкі, капаніры і інш. Менавіта фактар выкарыстання дрэва, як будаўнічага матэрыялу, і не дазволіў захавацца рускім фартыфікацыйным палявым умацаванням у межах сучаснай Беларусі. Уздоўж былой лініі фронту можна зараз выявіць у якасці парэшткаў рускіх пазіцый толькі парэшткі земляных палявых умацаванняў, як па лініі фронту, так і ў месцах размяшчэння інфраструктуры бліжняга тылу.

Сітуацыя ў арміі Германіі была іншай. Германія магла выкарыстоўваць не толькі свой прамысловы патэнцыял, але і патэнцыял акупаваных тэрыторый, у тым ліку і Царства Польскага – самай эканамічна развітай тэрыторыі ў складзе Расійскай імперыі. Як вынік, з 1915 г., па стабілізацыі лініі фронту на ўсходнім тэатры ваенных дзеянняў, з боку германскай арміі пачынаецца масіраванае ўзвядзенне жалезабятоннай палявой фартыфікацыі, у асноўным кулямётных адна ці шматамбразурных ДОКаў, артылейрысцкіх і артылерысцка-кулямётных ДОКаў, капаніраў для асабовага складу франтавых падраздзяленняў, боезапасаў і амуніцыі, палявых лазарэтаў.

Узвядзенне жалезабетонных фартыфікацыйных збудаванняў вялося напрацягу ўсяго стаяння фронту, з 1915 па кан. 1917 гг. На тэрыторыі Беларусі дадзеную фартыфікацыю можна сустрэць на ўсім працягу краіны, з поўначы на поўдзень, па лініі Дрысвяты-Відзы-Паставы-Возера Нарач-Смаргонь-Баранавічы-Агінскі канал-Пінск. Ёсць участкі фартыфікацыйных збудаванняў, выцягнутых толькі ўздоўж лініі фронту, захаваліся ўчасткі, якія ўтвараюць фартыфікацыйныя ансамблі, прыстасаваныя для кругаваў абароны – адносна доўгатэрміновых баявых дзеянняў у атачэнні войскаў праціўніка.

У 2008 г. у межах міжнароднай праграмы "Меморыя", дабраахвотнікі за ахову еўрапейскай культурнай спадчыны" Беларускім добраахвотным таварыствам аховы помнікаў гісторыі і культуры быў арганізаваны валанцёрскі летнік ў г. Паставы Віцебскай вобл. Перад ўдзельнікамі летніку стаяў шэраг задач па выяўленню, фіксацыі, добраўпарадкаванню помнікаў гісторыі і культуры, у тым ліку адна з задач была даследаваць і зафіксаваць германскія фартыфікацыйныя збудаванні часоў Першай сусветнай вайны ў ваколіцах горада Паставы, на заходнім беразе Задзееўскага возера.

Дадзеныя фартыфікацыйныя збудаванні пачалі ўзводзіцца толькі з вясны 1916 г. Да гэтага часу дадзеная тэрыторыя была ў бліжняй тылавой зоне Рускай імператарскай арміі і была саступлена германскім войскам па выніках Нарачанскай аперацыі 1916 г. Жалезабетонная фартыфікацыя лакалізована двумя вялікімі ўмацаванымі раёнамі непасрэдна ўздоўж лініі фронту побач з вёскамі Мажэйкі на поўначы і Дукі на поўдні. Размешчаны абараняльныя комплекы на высокай берагавой тэрасе Мажэйкаўскага возера і марэнный узвышанай градзе паміж Задзееўскім возерам і возерам Загацце. Паміж двума вышэйназванымі ансамблямі фартыфікацыя адсутнічае, хутчэй за ўсё з-за ланшафтнага фактару – ланцуг азёраў і забалочаная тэрыторыя нават у сучасны перыяд.

Найбольш дэтальныя натурныя даследаванні фартыфікацыйнага ансамблю праведзены у ваколіцах вёскі Дукі, на працягу ад паўднёвай часткі заходняга берага Задзееўскага возера, да паўночнага ўскрайку возера Загацце, на захад ад міжазёрнай пратокі. Міжазёрная пратока мае ў шырыню ад 3-х да 5-ці метраў, берагі яе пойменныя, моцна забалочаныя. Шырыня поймы парадку 300-400 метраў, найбольшая яе частка знаходзіцца на ўсходнім беразе, заходняя частка мае шырыню ад 50 да 100 м., і далей на захад ад поймы падымаецца высокая надпоплаўная тэраса, як частка ўзвышанага марэннага плато паміж двумя азёрамі.

Менавіта па грэбні надпоплаўнай тэрасы размяшчаецца лінія доўгатэрміновых агнявых кропак, а ў глыбі марэннага ўтварэння лакалізаваны жалезабетонныя капаніры. Агульная колькасць збудаванняў на дадзеным участку – 21. З іх – 9 доўгатэрміновых агнявых кропак і 12 капаніраў, 5 з якіх маюць прыкметы капаніраў для размяшчэння асабовага складу, а 7 маюць прыкметы складскіх памяшканняў. З 9-і доўгатэрміновых агнявых кропак 5 знаходзяцца ў задавальняючым стане, 1 збудаванне зруйнаванае, 4 маюць прыкметы моцных пашкоджанняў выбуховага характару.

Доўгатэрміновыя агнявыя кропкі падзяляюцца на артылерысцка-кулямётны дот (адна артылерысцкая і дзве кулямётныя амбразуры) на левым флангзе (паўднёвая аканечнасць заходняга берагу Задзееўскага возера), сем аднаабразурных кулямётных ДОКаў уздоўж надпоплаўнай міжазёрнай пратокі і пяціамбразурны кулямётны ДОК на правым флангзе, на паўночнай аканечнасці возера Загацце. Капанірныя збудаванні візуальна практычна не выяўляюцца ў сувязі з тым, што з-за гаспадарчай дзейнасці тэрыторыя, на якой знаходзіцца фартыфікацыйны ансамбль, з'яўляецца сельскагаспадарчым угоддзем, пры правядзенні прац па рэкультывацыі якога капаніры былі засыпаны грунтам, і зараз іх верхнія часткі практычна не выступаюць над дзённай паверхняй зямлі.

У глыбі паласы абароны , на ўсход ад вёскі Вялікая Олься і на захад ад вёскі Ліцвінкі размешчаны ўмацаванні прыкрыцця тылу асноўных фартыфікацыйных ансамбляў. Даследаваны фартыфікацыйныя збудаванні на захад ад вёскі Ліцвінкі. Гэта тры невялікія жалезабетонныя комплексы, ў склад якіх уваходзяць ДОКі, пры кожным з якіх маюцца жылы і складскі капаніры. На паўночным флангзе і ў цэнтры пазіцыі збудаванні зруйнаваны, захаваліся парэшткі, якія дазваляюць вызначыць план ДОКаў і капаніраў, на паўднёвым флангзе поўнасцю захаваўся Г-падобны ў плане трохамбразурны кулямётны ДОК з размешчаннем амбразур на захад, поўдзень і ўсход, складскі капанір і напаўзруйнаваны капанір для размяшчэння асабовага складу.

Пры аналізе зруйнаваных ДОКаў робіцца выснова, што паўночная агнявая кропка была таксама трохамбразурнай з люстраным адносна паўднёвага флангавага ДОКу размешчаннем амбразур – на поўнач, на ўсход і захад, а ДОК у цэнтры пазіцыі быў двухамбразурным з заходняй арыентацыяй кулямётнага бою. Практычна такая ж структура доўгатэрміновых агнявых кропак была прасочана і на ўсход ад вёскі Вялікая Олься пры звычайным візуальным аглядзе пазіцыі, больш дэтальныя даследаванні якой не праводзіліся, з-за незадавальняючага, напаўразбуранага стану збудаванняў.

Улічваючы ўдалае размяшчэнне ўсіх агнявых кропак у ланшафце, што стварае выдатныя сектары абстрэлу і назірання за мясцовасцю, прыкрыццё асноўных умацаваных пазіцый з тылу, можна зрабіць выснову пра непрыступнасць дадзеных вузлоў абароны, пра іх здольнасць трымаць абарону нават у атачэнні пры ўмове прарыву лініі фронту на стыках падраздзяленняў і на стыках палявой фартыфікацыі. Увесь ансамбль уяўляе сабой арыгінальны помнік фартыфікацыйнай думкі пач. 20 ст. нягледзячы на значныя пашкоджанні, якія яму нанесены ў выніку гаспадарчай дзейнасці, што актыўна пачалася тут менавіта пасля Другой сусветнай вайны, пасля канчатковай калектывізацыі, якая на землях Заходняй Беларусі была праведзена ў кан. 40 – пач. 50-х гг. 20 ст. Да апошняга часу пашкоджанні фартыфікацыі і яе знішчэнне адбывалася і пры ліквідацыі выяўленых выбухованебяспечных прадметаў, якія масава знаходзяць тут, як рэха баёў Першай сусветнай, ваеннымі сапёрамі. Не абыходзіць бокам гэтыя ўнікальныя помнікі і звычайны вандалізм.

У той жа час, у міжваенны перыяд, дадзеныя абарончыя збудаванні былі закансерваваны і захоўваліся ў задавальнячым стане ў сувязі з тым, што мяркуючы па надпісам унутры памяшканняў, напрацягу 1921 – 1923 гг. яны былі ўзяты на баланс ваенным ведамствам Другой Рэчы Паспалітай, як абарончыя збудаванні ўсяго ў 70-і км. ад савецка-польскай мяжы, на выпадак перспектыўнай вайны з усходнім суседам. У адрозненні ад Баранавіцкага ўмацаванага раёна працы па мадэрнізацыі фартыфікацыйных ансамбляў у ваколіцах Паставаў не праводзіліся.